■ Спорт-тайм

# «ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ НЯМА НЕМАГЧЫМАГА»

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра тое, як прайшоў дамашні этап Кубка свету па мастацкай гімнастыцы і якія адзнакі турніру паставілі замежныя госці. Таксама знаёмімся з вынікамі матчаў чэмпіянату краіны па футболе і турніру па боксе, які прыняў Мінск.**

**1. *Айчынныя спартсменкі заваявалі 10 медалёў (2 залатыя, 5 сярэбраных, 3 бронзавыя) на дамашнім этапе Кубка свету BSB Bank «чэлендж» па мастацкай гімнастыцы.***



Кацярына Галкіна ў кампазіцыі з мячом стала першай, выступаючы з абручом заваявала бронзавую ўзнагароду, таксама трэцяй яна стала ў практыкаванні са стужкай. На другую прыступку п'едэстала ў практыкаваннях з мячом і стужкай падымалася маладая беларуская спартсменка Аліна Гарнасько. Таксама яна заваявала бронзавую ўзнагароду выступаючы з булавамі і сярэбраны медаль у індывідуальным мнагабор'і.

У групавых практыкаваннях у беларускіх спартсменак 3 медалі: два сярэбраныя і адзін залаты.

Нагадаем, мінскі этап Кубка свету стаў падрыхтоўкай да планетарнага першынства ў італьянскім Пезары. Удзел у спаборніцтвах прынялі грацыі з 24 краін. Тое, што Беларусь выдатна справілася з правядзеннем турніру, адзначыў **прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі Марынары ВАТАНАБЭ.**

*— Нягледзячы на тое, што ў вас было вельмі мала часу для падрыхтоўкі, усё прайшло на высокім узроўні. Для беларусаў няма нічога немагчымага, спаборніцтвы былі арганізаваны проста бліскуча, этапы Кубка свету будуць праводзіцца ў Мінску і ў далейшым,* — падкрэсліў кіраўнік міжнароднай федэрацыі.

**2. *Адбыліся матчы 17-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Гульцы «Мінска» атрымалі перамогу над барысаўскім БАТЭ — 1:0, яшчэ два нядзельныя матчы завяршыліся з аднолькавым вынікам 1:1 — «Нёман» сустракаўся з «Іслаччу», а «Тарпеда-БелАЗ» са «Слуцкам». Раней «Дняпро» саступіў «Віцебску» — 1:2, «Гарадзея» згуляла ўнічыю са «Славіяй» — 0:0, «Дынама» (Брэст) было мацнейшым за «Крумкачоў» — 3:0.

Учора ўвечары лідар першынства салігорскі «Шахцёр» у гасцях сустрэўся з футбалістамі «Гомеля», а мінскае «Дынама» ў Наваполацку — з «Нафтанам».

**3. *Футбалісты ўкраінскай «Александрыі» будуць сапернікамі барысаўскага БАТЭ ў барацьбе за выхад у групавы раўнд Лігі Еўропы.*** Такі вынік жараб'ёўкі, якая адбылася ў штабкватэры УЕФА ў швейцарскім Ньёне. Першы матч раўнда плэй-оф барысаўчане правядуць 17 жніўня на полі «Барысаў-Арэны», паядынак у адказ пройдзе 24 жніўня ў Александрыі.



**4. *Нашы спартсмены заваявалі 22 узнагароды на міжнародным турніры па боксе, прысвечаным памяці Героя Савецкага Саюза Віктара Лівенцава, які завяршыўся ў мінскім Палацы спорту.***

Уладальнікамі залатых медалёў сталі: Яна Бурым (вагавая катэгорыя — 51 кг), Вадзім Панкоў (75 кг) і Сяргей Карнееў (91 кг). У скарбонцы беларускай зборнай таксама шэсць сярэбраных узнагарод і трынаццаць бронзавых.

Удзел у турніры прынялі больш за 100 баксёраў з 15 краін. Спаборніцтвы сталі для спартсменаў важным этапам падрыхтоўкі да чэмпіянату свету, які пройдзе з 25 жніўня па 3 верасня ў Гамбургу.

**5. *Дзве ўзнагароды заваявалі беларускія плыўцы ў першы дзень этапу Кубка свету ў Берліне.*** Яўген Цуркін стаў сярэбраным прызёрам на дыстанцыі 50 м батэрфляем, а Ілья Шымановіч падняўся на трэцюю прыступку п'едэстала на дыстанцыі 100 м брасам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.36 | 20.54 | 15.18 |
| Віцебск — | 5.20 | 20.48 | 15.28 |
| Магілёў — | 5.26 | 20.44 | 15.18 |
| Гомель — | 5.28 | 20.35 | 15.07 |
| Гродна — | 5.52 | 21.08 | 15.16 |
| Брэст — | 5.58 | 21.03 | 15.05 |

**Месяц**

*Поўня 7 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

**Пр.** *Праскоўі, Ермалая, Майсея.*
**К.** *Дамініка, Цыпрыяна, Эміліяна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 8 ЖНІЎНЯ

**Сёння ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень альпінізму, ці Дзень альпініста — свята, якое не ведае межаў, аб'ядноўваючы ўсіх адважных мужчын і цвёрдых духам жанчын. З'яўленню гэтага свята мы абавязаны двум смельчакам-швейцарцам — урачу Мішэлю-Габрыэлю Пакарду (1757—1827) і горнаму праваднiку Жаку Бальма. 8 жніўня 1786 года яны першымі дасягнулі найвышэйшага пункта Альпаў — вяршыні Манблан, вышыня якой складае 4810 метраў над узроўнем мора.**

**1899** год — вынаходнік з Мінесоты Альберт Маршал запатэнтаваў першы халадзільнік. Халадзільныя канструкцыі існавалі



і раней. У асноўным яны дзейнічалі за кошт пакупнога лёду. Першыя дамашнія халадзільнікі спажывалі шмат дроў, вугалю і газы. У 1911 годзе фірма «Джэнерал электрык» наладзіла выпуск халадзільнікаў больш-менш сучаснага тыпу: халадзільная машына змяшчалася ў кухоннай шафе. Аднак яна занадта гучна шумела і, з-за таго, што працавала на газе, дрэнна пахла. Гэта быў яе галоўны недахоп. У 1926 годзе дацкі інжынер Сціндруп распрацаваў бясшумны халадзільнік. Пасля гэтага апарат хутка стаў у Амерыцы папулярным побытавым прыборам. Праўда, першыя халадзільнікі каштавалі ў два разы даражэй, чым аўтамабілі маркі «Форд». Іх называлі «дамашняй фабрыкай холаду».

**1900** год — у Бостане па ініцыятыве студэнта Гарвардскага ўніверсітэта Дуайта Дэвіса адбыўся першы Міжнародны тэнісны турнір — матч тэнісістаў ЗША і Англіі. Дата нараджэння Кубка Дэвіса — неафіцыйнага чэмпіянату свету сярод мужчынскіх тэнісных камандаў.

**1912** год — нарадзіўся (в. Кулакі, цяпер у Салігорскім раёне) Аркадзь Чарнышэвіч, беларускі пісьменнік. У 1928 годзе падрыхтаваў і адаслаў у Белдзяржвыдавецтва зборнік апавяданняў «Хаты ажываюць», які не быў прыняты да друку. У 1930-м бацьку раскулачылі і адправілі на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала, а сям'ю вывезлі ў Качоўскі раён Комі-Пярмяцкай акругі. Аркадзь Чарнышэвіч працаваў у пасёлку Янчэр рабочым на лесараспрацоўках, загадчыкам мясцовай крамы, настаўнічаў. У 1950 годзе вярнуўся на радзіму, працаваў настаўнікам на Мядзельшчыне. Член Саюза пісьменнікаў СССР. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Суседзі», «Новы дом», раманаў «Світанне», «На мяжы стагоддзяў» і інш. Для дзяцей напісаў аповесці «У адной сям'і», «На сажалках», зборнікі апавяданняў «Зосін лужок», «Апавяданні старога Арцёма» і інш. Памёр у 1967 годзе.

**1945** год — у адпаведнасці з рашэннямі Крымскай і Патсдамскай канферэнцый і пасля адмовы Японіі выканаць патрабаванні саюзнікаў СССР па антыфашысцкай кааліцыі аб безумоўнай капітуляцыі Савецкі Саюз аб'явіў вайну Японіі.

**1959** год — пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР пасёлак Новастаробінск, які ўзнік у сувязі з будаўніцтвам Старобінскага калійнага камбіната, пераўтвораны ў рабочы пасёлак Салігорск.

**Было сказана**

**Уільям ШЭКСПІР, англійскі драматург:**
*«Мы ведаем, хто мы ёсць, але не ведаем, кім мы можам быць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Дрэнны той урач, які купляе каньяк.**

— Як ідуць пошукі працы?
— Цяжка. Усюды гэтыя восем гадзін трэба быць цвярозым.

**Жыць у маленькім горадзе — гэта калі цябе ведаюць яшчэ да знаёмства з табой.**

— Кацярына Іванаўна, я хачу ажаніцца з вашай дачкой.
— Толькі цераз мой труп.
— Гучыць прывабна, але два святочныя банкеты я не пацягну.

**Акцыя ў фітнес-клубе: «Калі вы купіце ў нас сямейную карту для сябе, жонкі і дзіцяці, то ваша палюбоўніца можа наведваць наш клуб бясплатна!»**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3047.
Нумар падпісаны ў 19.30 7 жніўня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12